ской начинке, мало ли о чем»[6]. Акрамя гэтага, героі-ідэёлагі ў філасофскім творы «абрастаюць» персанажамі, якія іх дублірукоць. Гэта дазваляе пісьменніку стварыць «персаніфіцыраваную сістэму адценняў ідэі, якая абмяркоўваецца»[7].

Да ліку метажанравых асаблівасцей філасофскай літаратуры належаць катэгорыі часу і прасторы. Пісьменнікі-філосафы імкнуцца знайсці такую форму, каб яна перадавала не столькі рух чалавека ў часе, колькі засяроджанне часу ў чалавеку, дзякуючы чаму герой становіцца прадстаўніком чалавецтва, суб'ектам гісторыі. Тут да месца будзе прывесці апісанне М. М. Бахціным паняцця «вертыкальнага часу»: «Часавая логіка гэтага вертыкальнага часу — чыстая адначаснасць усяго (ці «суіснаванне ўсяго ў вечнасці»). Усё, што на зямлі раздзелена часам, у вечнасці сходзіцца ў чыстай адначаснасці існавання. Гэтыя раздзяленні, гэтыя «раней» ці «пазней», якія выносяцца часам, неістотныя, іх трэба знаць, каб зразумець свет, трэба супаставіць усё ў адным часе, у разрэзе аднаго моманта, трэба бачыць увесь свет як адначасны. Толькі ў чыстай адначаснасці ці, што адно і тое ж самае, у пазачаснасці можа раскрыцца сапраўдны сэнс таго, што было, што ёсць і што будзе, таму што тое, што раздзяліла іх, — час — пазбаўлена праўдзівай рэальнасці і асэнсавальнай сілы. Зрабіць рознačаснае адначасным, а ўсе часава-гістарычныя раздзяленні і сувязі замяніць чыста сэнсавымі, пазачасна-іерархічнымі раздзяленнямі і сувязямі — такая пабудова вобраза свету па чыстай вертыкалі»[8]. Гэты прынцып суаднесенасці сёняшняга дня з мінулым мае выключнае значэнне для філасофскага жанру. Ён неабходны для больш паглыбленага выяўлення асноўных заканамернасцей, для спасціжэння галоўнага ў сучаснасці.

Прастора мае ў філасофскіх творах здольнасць да бязмежнага пашырэння, з аднаго боку, і лакалізацыі — з другога. Аднак у гэтых супрацьлеглых тэндэнцый адна сутнасць: прастора субстантная, універсальная, і таму сусвет ці яго куточак — неістотна. І тое, і другое з'яўляецца праяўленнем універсальнай сутнасці свету. Іншая справа, што на гэтай прасторы, як правіла, значна менш падрабязнасцей і дэталей, характэрных для іншых метажанраў літаратуры. Такім чынам, лакалізаваныя час і прастора пераўтвараюцца ў глабальныя, усечалавечыя час і прастору.

Пісьменнік філасофскага складу не імкнецца да эпічна разгорнутага апісання падзей. Звяртаючыся да значных, этапных падзей, ён імкнецца зразумець і растлумачыць іх з пункту гледжання вечнасці, агульначалавечага вопыту маралі і культуры. Падзеі рэальнага жыцця цікавяць яго не самі па сабе, а ў сферы іх уздзеяння на псіхалогію чалавека і ў той меры, у якой яны пераходзяць у асацыятыўную памяць і становяцца прычынай кардынальных змен у лёсе. Для таго, каб ідэі знайшлі сваё найлепшае ўвасабленне, пісьменнік-філосаф канцэнтруе падзеі, знімае другарадныя дэталі.

Вельмі вялікая ў філасофскай прозе роля ўмоўных форм — сімвалаў, міфаў, сноў, літаратурных рэмінісцэнцый і г. д. Сукупнасць пералічаных якасцей і вызначае спецыфіку мастацкага твора як філасофскага.

[1] Кожинов В. В. // Словарь литературоведческих терминов. М., 1974. С. 436.
[2] Урбан А. // Звезда. 1978. № 9. С. 210.
[3] Ершов Л. Ф. // Литература в школе. 1987. № 5. С. 5.
[4] Спивак Р. Русская философская лирика: Проблемы типологии жанров. Красноярск, 1985. С. 13.
[5] Днепров В. Идеи времени и формы времени. Л., 1980. С. 331.
[6] Леонов Л. Собр. соч.: В 10 т. М., 1982, Т. 3. С. 452.
[7] Агеносов В. В. Советский философский роман. М., 1989. С. 34.
[8] Бахтин М. Вопросы литературы и эстетики. М., 1975. С. 307.

Н. С. МАЖЭЙКА

## ЧАРОЎНАЯ СІЛА МАСТАЦКАГА СЛОВА
## (пра творчасць Я. І. Носава)

«Першым на барыкады прагрэсу выходзіць слова. Слова-вокліч, слова-праўда... Мадэлі слова маюць сапраўды тытанічную сілу»[1]. Такі вывад са свайго творчага вопыту зрабіў сямідзесяцігадовы рускі пісьменнік Яўген Іванавіч Носаў.

Нарадзіўся Я. І. Носаў у г. Курску ў 1925 г., адсюль васемнаццацігадовым юнаком пайшоў на фронт. На курскай зямлі і вытокі яго творчасці і менавіта адсюль — вельмі глыбокія, захапляючыя праўдай жыцця яго творы, яго цудоўныя пейзажныя замалёўкі, яго любоў да зямлі, клопаты аб захаванні яе цудоўнай прыгажосці.

Упершыню надрукаваўся Яўген Носаў у 1947 г., а скончыўшы Вышэйшыя літаратурныя курсы ў Маскве (1962), галоўнай справай жыцця зрабіў літаратуру, у якой ён мае сваю тэму, сваё бачанне свету, свой стыль і склад.

Адзін за другім выдаюцца яго зборнікі, аповесці і апавяданні («На рыбаковай сцяжынцы» — 1958, «Трыццаць зярнят» — 1961, «Дзе прачынаецца сонца» — 1965, «Лазовы чай» — 1968, «Мост» — 1970, «Усвяцкія шаломаносцы» — 1982 і інш.), дзе галоўныя героі (у большасці) —вясковыя жыхары, духоўны свет якіх пісьменнік ведае дасканала, ведае яго адценні, ведае пачуцці сваіх герояў, іх мары і надзеі. Але чытач не знойдзе на старонках твораў пісьменніка — удзельніка Вялікай Айчыннай вайны — ні франтавых атак, ні артабстрэлаў, ні бамбёжак, ні жудасных акопных будняў. Такія аповесці, як «Усвяцкія шаломаносцы», «Чырвонае віно перамогі», «Шапэн, саната нумар два» — пра мірны час. Але гэта і пра вайну! Пра жудасную бяду-навалу, з'яву антычалавечную, калі звыклае жыццё чалавека адразу разбураецца, калі трэба кінуць свае палі і працу на іх, кінуць родную хату і сваіх блізкіх, калі жыццё падзяляецца на дзве несумяшчальныя часткі — «да вайны» і «вайна».

Героі Носава не «на вайне», але яе чорнымі крыламі перакрэслена ўсё іх жыццё, навакольны свет ужо не існуе ў іх усведамленні такім, якім ён павінен быць. Вось, пачуўшы пра пачатак вайны, бяжыць Касьян («Усвяцкія шаломаносцы») дадому, бяжыць і не пазнае ні сваёй хаты, ні вёскі наогул. «Вытручаным, **пашарэўшым** зрокам глядзеў ён на пагорак, і ўсё там уяўлялася яму **шэрым** і незнаёмым: сіратліва-**шэрыя** хаты, **шэрыя** лозы, **шэрыя** гароды, што збягалі ўніз па грудку, **шэрыя** аканіцы на нейкіх патухлых, невідушчых вокнах роднай хаты, якая, здавалася, стаяла быццам без даху з расчыненымі ў **шэрую** пустэчу дзвярыма»[2]. Нават сама цішыня, «як і сам ранак, здаваліся Касьяну **шэрай** безжыццёвай нематой» (383)[3].

Юрый Нагібін назваў аповесць «Усвяцкія шаломаносцы» адным з самых глыбокіх, пранікнёных твораў аб Вялікай Айчыннай вайне і дадаў: «хоць там і не страляюць»[4]. Сапраўды, у творах Я. Носава не страляюць, але яны аб вайне, яны супраць яе. Той жа Касьян, бегучы з сенажаці, адчуў гэтае слова «вайна» як атруту, якая разбурыла ўсё звыклае ўспрыняцце быцця, ён «...адчуў незнаёмае пачуццё няўтульнасці. Слова «вайна», якое ўджаліла яго яшчэ на сенажаці, як раптоўны апёк, які ён спачатку, бадай, і не вельмі адчуў, зараз усё больш адчувалася і неяк захапіла ўсю яго свядомасць нейкай балючай прысутнасцю» (357).

Пісьменнік наўмысна падкрэслівае слова «вайна», бо яно, гэтае слова, ніяк не можа быць звязана са звыклымі жыццёвымі ўяўленнямі.

З болем і жахам успамінае вайну Чапурын, герой аповесці «Шуміць лугавы аўсянік». У свядомасці ён ніяк не можа «вярнуцца» з вайны. Яму здаецца, што яго жыццё да вайны было «страшэнна даўно. Як да нараджэння Хрыстова»; ён нават уявіць што-небудзь з тых гадоў не можа. «Заплюшчу вочы і бачу... нейкія бэлькі вогненныя валяцца. Людзі бягуць... Чорныя супраць агню... Бягуць і падаюць... Ніяк я не праб'юся скрозь гэтыя гады. З дзевятага пайшоў. Перавязаў вяровачкай свае фізікі-хіміі, недаробленыя планеры на гарышча схаваў і пайшоў. І ўсё некуды пайшло. Самы лепшы кавалак жыцця. Быццам і не я быў тады на свеце... быццам упершыню я з'явіўся на свет не ў радзільным доме, а ў армейскім шпіталі. Вынырнуў з хлараформу, быццам з небыцця»[5].

Успаміны пра вайну — цяжкія ўспаміны. Таму былыя салдаты («Шапэн, саната нумар два») не вельмі любяць гэтыя ўспаміны. Лепш пажартаваць на тым полі, дзе без малага трыццаць гадоў таму ішлі кровапралітныя баі, разгаралася бітва, ад якой «...уратаваныя народы маглі б пачаць новы адлік часу» (299). Старыя салдаты, сарамліва разглядаючы адзін на адным баявыя ўзнагароды, жартуюць, ці «надзець

ордэны, ці не», бо ад іх дзірка на адзенні, лепш медалі, «ад іх на адзенні ніякіх слядоў не застаецца» (299).

Цікава, што сам Я. І. Носаў, успамінаючы, як ён «сустракаў сваю трэцюю ваенную вясну паміж Рагачовам і Новым Быхавам», не мог не адзначыць, што нават там, на вайне, у хвіліны даволі рэдкага зацішша салдат бачыў працяг жыцця — надышоўшую вясну, як сімвал гэтага жыцця, як супроцьстаянне вайне. «Вясна ўсё болей нагадвала пра сябе. І вось аднойчы скрозь бліндажны накат... забарабаніла вясновая марзянка. Усе, узрадаваныя гэтымі абставінамі, вылецелі вон. Вясна! Якое ж гэта акрыляючае пачуццё. Асабліва тут, на фронце, дзе ўсё — і чалавек, і кожны куст, і ўсялякая птушка — на вагах жыцця і смерці»[6].

Я. І. Носаў належыць да ліку тых пісьменнікаў-шасьцідзесятнікаў, чыя творчасць цесна звязана з жыццём пасляваеннага сяла. Ён бачыць, што вёска другой паловы дваццатага стагоддзя накіравалася ў горад, яна, па сутнасці, гіне, «хаты глядзяць з-за платоў вялізнымі ямамі вокнаў, забітых крыж-накрыж дошкамі» і што «існуе небяспека зніжэння духоўных маральных ідэалаў», што «ідэал нашага жыцця наогул згубіў свае абрысы»[7]. Глыбокім болем прасякнуты гэтыя словы пісьменніка, як і ўвесь яго артыкул «Што мы перабудоўваем», болем за сваю дзяржаву, яе будучыню, яе народ. Пісьменнік не можа быць абыякавым да таго, што «існуюць людзі па абавязку, у якіх нічога не баліць, якія няздольныя ўстаць на абарону справядлівасці, адстойваць праўду»[8]. Яго ж героі — людзі зямлі, людзі, якія працуюць на ёй, — сумленныя і памяркоўныя — нясуць запас чалавечнасці і дабрыні. Вось нялёгкі шлях даяркі Аксінні («Пяты дзень восеньскай выставы»), вось падлеткі Міцька і Апалошка, якія асвойваюць нялёгкую працу вясковага каваля («У чыстым полі за прасёлкам») і шмат іншых носаўскіх персанажаў. Гэта простыя і шчырыя людзі са сваімі пачуццямі, са сваёй любоўю да гэтай зямлі, ад якой яны неаддзельныя. І галоўная тэма пісьменніка — Зямля, Жыццё і Чалавек на гэтай зямлі — гучыць у такіх апавяданнях, як «На досвітку», «За даламі, за лясамі», «Шуміць лугавы аўсянік», «Падпасак», «Варка», «У чыстым полі за прасёлкам», «Партрэт» і да т. п.

Галоўная тэма разгаліноўваецца мноствам падтэм: лёс сучаснай вёскі, маладое каханне і адзінокая старасць, памяць і грошы, прырода і ахова навакольнага асяроддзя.

Так, у аповесці «Шуміць лугавы аўсянік» пранікнёнай філасофскай глыбінёю і хвалюючым спачуваннем насычаны апісанні няўдалага жаночага кахання, асірочанага вайной, сціскаючай сэрца адзіноты цэнтральнага героя аповесці Чапурына. Сапраўды, нялёгкі лёс напаткаў Анфіску, якая выхоўвае пазашлюбнае дзіця; у Чапурына ёсць жонка, але яна адмовілася ехаць з ім разам працаваць у вёску. Пачуцці, якія ўзніклі паміж гэтымі людзьмі, узраслі на фоне роднай прыроды, іх каханне расквітнела там, дзе яны нарадзіліся, выраслі, дзе разам працуюць. І здаецца, што, зліваючыся са шчасцем закаханых, наваколле поўніцца таксама радасцю і прыгажосцю. «Узнёсла-блакітнае святло залівала паляну. Было відаць кожную былінку, кожны лісток і ўсё ўсюды іскрылася і блішчэла. Светлая паверхня рэчкі за берагам абрыва кальчужна серабрылася... Уся тут зямля, — кажа Анфіска, — увесь свет»[9].

Сапраўдную еднасць з усім светам адчувае і Варка, першае ледзь узнікшае каханне якой і напоўненае пяшчотнасцю каханне падлетка-цыгана мы бачым у аповесці «Варка». «Знік гарызонт, адпушчаная на волю зямля разбеглася ва ўсе бакі, таямніча ўваходзіла ў глыбіню ночы і распасціралася перад Варкай у велічна-спакойнай цішыні... Менавіта ў гэтыя хвіліны надыхода ночы Варка адчувала найвялікшую блізкасць і еднасць сваю з простай і звычайнай часткай зямлі, распасцёртай вакол яе... Яна адчувала ў сабе нейкую свабоду, і тады лугі заўсёды цягнулі і звалі яе некуды» (85).

Шмат цудоўных карцін прыроды знойдзем мы ў творах розных пісьменнікаў розных часоў. Але ў Носава — гэта не проста прырода, гэта людзі і іх праца, цяжкая і радасная, горкая і шчаслівая, натхняючая і неабходная. Тэма прыроды і працы непадзельныя, як непадзельныя любоў да зямлі і неабходнасць яе абараняць і ў мірны час. Нельга не адзначыць майстэрства Носава-пейзажыста, які любіць прыроду, які бачыць усе яе фарбы і ведае яе травы і дрэвы, які можа ў маленькай

замалёўцы ўзняцца да вяршынь сапраўднага мастацтва. З'явы прыроды выклікаюць у пісьменніка зусім асаблівыя пачуцці, нешта казачнае бачыцца яму ў навакольным свеце. У жураўліным крыку чуецца «нешта глыбіннае... нейкі русалчын ускрык, таямнічы і смутны, які міжволі пераносіць уяўленне ў свет напаўзабытых казак дзяцінства... Ды і ўсё з майго вакна мне бачылася казачным», — дадае Носаў (7).

Менавіта тут, на думку пісьменніка, нараджаліся казкі пра «мядзведзя, у якога драўляная нага, пра калабок, пра сястрычку Алёнку і яе брацікa Івана і пра тое, як жылі-былі дзед ды баба і як у іх была курачка-раба» (7).

Пісьменніку даступныя ўсе пахі і гукі. Ён адчувае, як з-за лесу «цягне грыбной прэллю, імхамі і абмытай ялінкай» (195), як «дурманліва і спякотна пахне толькі што скошаная трава» (205), як «крыштальна вызвоньваюць кроплі расы, падаючы з навіслых кустоў у чуйную ваду, як на ўсё наваколле мырмочаць струменьчыкі вакол патануўшага карча» (198). Ён заўважае, як «пасля дажджу навокал раптоўна выцягваецца ажно да поясу лугавы аўсянік, закрываючы сабой канюшыну, і лугі адзяваюцца пяшчотнай фіялетавай дымкай» (196).

Пісьменнік выкарыстоўвае рознага роду эпітэты, але яны ў яго заўсёды на сваім месцы, арганічна ўключаны ў апавяданне, выконваюць мэтанакіраваныя функцыі. Так, напрыклад, падкрэсліваючы кантраснасць успрыняцця, Носаў заўважае «на чарацінцы, якая выторкваецца з вады, жоўтую пліску», якая «перакрэслівае сабою чырвонае сонца» (206). Рэчка Дзясна ўвечары ўспрымаецца як «разавата-прыціхлая» (207), вясновы дождж — «добры і вясёлы» (226), а паляна, дзе ўпершыню сустрэліся Анфіска і Чапурын, «залітая радасна-блакітным святлом» (213). Пісьменнік здольны бачыць нязвыклае ў звычайных праявах навакольнага свету, бачыць казачна-чароўнае вакол сябе ў сонечным святле дня і месячным ззянні ночы. Напрыклад, лірычны стан герояў аповесці «Шуміць лугавы аўсянік» добра адчуваецца ў метафарычным малюнку месячнай ночы, калі «месяц, падняўшыся ў зеніт, накаліўся да асляпляльнай блакітнасці, неба навокал рассунулася... і лілося на лес, на паляну, на белае кіпенне кветак дымна-трапяткім блакітным светлападам» (213). Пераважнасць серабрыста-светлых колераў стварае яскравую, казачную карціну летняй месячнай ночы, карціну, якая ўспрымаецца чытачамі як намаляваная вялікім майстрам.

Мова пісьменніка музычная, яна настройвае чытача на нейкую лірычную хвалю. Нават назвы асобных яго апавяданняў набліжаюцца да народных спеваў («У чыстым полі за прасёлкам», «І адплываюць параходы і застаюцца берагі», «За даламі, за лясамі» і інш.). І здаецца зусім бясспрэчным сцвярджэнне пісьменніка, што «чалавеку ніколі не перастануць мроіцца казкі... На тое ён і чалавек» (229).

[1] Носов Евгений // Лит. газета. 1988. 28 дек. (Пераклад з рускай мовы ўсюды наш — Н. М.).

[2] Ён жа. Усвятские шлемоносцы: Повести и рассказы. М., 1982. С. 358. Далей пры спасылках на гэтае выданне ў тэксце пазначаецца старонка. Астатнія цытаты агаворваюцца асобна.

[3] Падкрэслена намі — Н. М.

[4] Нагибин Юрий // Октябрь. 1988. № 2. С. 197.

[5] Носов Евгений. В чистом поле за проселком: деревенские повести. М., 1974. С. 19.

[6] Ён жа. // Лит. газета. 1990. 9 мая.

[7] Ён жа. // Лит. газета. 1988. 20 апр.

[8] Ён жа. // Лит. газета. 1988. 28 дек.

[9] Ён жа. В чистом поле за проселком. С. 16.

Е. А. ЛЯВОНАВА

## «НЕАДОЛЬНАЕ АБАЯННЕ ТАТАЛІТАРЫЗМУ»
### (раман-антыўтопія П. Зюскінда «Парфума»)

Патрык Зюскінд нарадзіўся 26 сакавіка 1949 г. у сям'і прафесійнага публіцыста ў невялікім заходнегерманскім гарадку Амбаху. Тут ён закончыў пачатковую школу і гімназію, атрымаў музычную адукацыю,